# Станаўленне хрысціянскай цывілізацыі ў Еўропе і Беларусі

Лекцыя 2.

# План лекцыі:

- Асноўныя рысы эпохі Сярэднявечча ў Еўропе.
- Этнічныя працэсы на беларускіх землях.
- Першыя княствы на тэрыторыі Беларусі.
- Культура на Беларусі IX-XIII ст.

# Пытанне 1.

- Еўрапейская цывілізацыя ў Сярэднія вякі ўзнікла як вынік аб'яднання трох асноў: традыцый Рымскай Імперыі, хрысціянства і варварства.
- У 4 ст. хрысціянства стала афыіцыйнай рэлігіяй у Рыме.

# 1. Хрысціянства

- Распаўсюдзілася ў Еўропе, найперш у гарадах.
- У кан. 4 ст. Папа Рымскі афіцыйна становіцца галавой царквы.
- Падзенне Рыма ператварыла хрысціянскую царкву ў законную пераемніцу грэка-рымскай цывілізацыі.

# 2.Вялікае перасяленне народаў (4-10 ст.)

- У 378 г. готы разграмілі рымскую армію.
- У 445 г. вандалы з Паўночнай Афрыкі разрабавалі Рым.
- У 476 г. правадыр герулаў Адаакр зверг апошняга імператара Рыма Аўгустула.
- У 481 г. кароль Хлодвіг заснаваў каралеўства франкаў. 496 г. ён хрысціўся.
- У 6-8 ст.рассяляюцца славяне,саксы, у 8-10 ст.–венгры, арабы, нарманы.

# Першыя дзяржавы ў Еўропе:

- У 7-9 ст. усталяваліся палітычныя саюзы будучых французаў, венграў, іспанцаў, немцаў, англаў, датчан, палякаў, русі і гд. *Сфармавалася этнічная мапа сучаснай Еўропы.*

# 3.У сярэднявеччы фарміруюцца структуры (класы) грамадства:

- Феадалы (духоўныя і свецкія) – уласнікі зямлі.
- Сяляне – трымальнікі зямлі (асабіста свабодныя і асабіста залежныя) “заключалі дамову” аб умовах валодання пасля чаго траплялі ў залежнасць

# У 5 – 10 ст. У Заходняй Еўропе

- Адывалася ўсталяванне феадальных адносін: фарміраваліся васальна-ленныя адносіны, зямля канцэнтравалася ў руках феадалаў, зараджаліся дзяржавы.

<u>4. хрысціянская царква, авалодала манаполіяй на адукацыю і ідэалогію.</u>

# РАССЯЛЕННЕ СЛАВЯН У ЕЎРОПЕ



# Пытанне 2.

- Кіеўская Русь – раннефеадальная дзяржава ўсходніх славян 9 – 12 стст.
- Узнікла ў выніку аб'яднання 2-х протадзяржаўных утварэнняў "Куявія" (паляне, севяране, вяцічы) і "Славія" (чудзь, славене, мера, крывічы).
- "Аповесць мінулых гадоў" звязвае ўтварэнне дзяржавы з заклікам варагаў у Ноўгарад (князь Рурык), Куявія была даніцай Авараў і хазараў, але вызвалілася ў 9 ст.

# Паводле крыніц 9-11 стст.

- Назва “Русь” ахоплівае ўсю ўсходнеславянску тэрыторыю
- Слова “русь” азначала дружыну князя, потым праваслаўных верніка, а “Руская зямля” – падуладную князю тэрыторыю.
- У “Аповесці мінулых гадоў” (12 ст.) Рускай зямлёй называецца Кіеўскае княства і супрацьпастаўляецца “крывіцкім” Смаленскаму і Полацкаму к-вам.

# Кіеўская Русь прадстаўляла федэрацыю княстваў

- На чале дзяржавы стаяў Вялікі Князь, яму падпарадкоўваліся мясцовыя князі дынастыі Рурыкавічаў.
- Уладу мела і веча – народны сход. Апалчэнне падпарадкоўвалася не князю, а вечу. Роля веча змяншаецца да 11 ст.
- Аснову грамадскага ладу складае суседская абшчына

# САЮЗЫ ПЛЯМЁН НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ



# У 8-9 стст. Летапіс узгадвае 15 плямёнаў славян.

- У 5-8 стст. Тэрыторы Беларусі займалі плямёны ўсходніх балтаў.
- У 6-8 стст. На паўднёвым захадзе з’явіліся плямёны старажытных славян.
- Крывічы – у вярхоўях Дняпра, Зах. Дзвіны, Волгі, на поўдні Чудскага возера. У ваколіцах Полацка яны называліся палачане

# У 10 ст. асновай племяннога княжэння крывічаў стала Полацкае к-ва.

- Да яго належылі гарады Полацк, Віцебск, Лукомль, Браслаў, Менск, Ізяслаўль, Лагойск, Орша, Копысь, Барысаў.

# Крывічы

- У антрапалагічным плане пераважаюць балта-славянскія рысы (паўночнаеўрапейскі тып).
- Мова славянская.
- Славянскія-бранзалетападобныя скроневыя кольцы са скручанымі канцамі, даўгія курганы.
- Балцкія элементы – бранзалеты са змяінымі галавамі, спіральныя пярсцёнкі, грыўны

# Дрыгавічы (паўднёвая і сярэдняя Беларусь)

- Жылі паміж ад Прыпяцці да Менска
- У культуры пераважалі славянскія элементы: Зярнёныя пасярэбраныя скроневыя кольцы.
- Да балцкіх традыцый адносіцца пахаванне нябожчыкаў у дамамвінах-церамах, змеепадобныя бранзалеты.
- Слова “дрыгавічы” ад балцк. “сыры”, ці слав. правадыра з імём Другавіт

# Радзімічы

- Займалі тэрыторы паміж Дняпром і Дзясной (Гомель).
- Мова славянская.сяміпромневыя скроневыя кольцы.
- Балцкія элементы: шыйныя грыўны, бранзалеты са змяінымі галавамі.
- Назва ад міфічнай асобы правадыра, які прывеў іх ”з ляхаў”- Радзіма.

# Канцэпцыі этнагенэзу беларусаў:

- Крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкая (Грынблат М., Доўнар-Запольскі М.)
- Польская (Галембоўскі Л.) і вялікаруская (Карамзін, Салаўёў)
- Крывіцкая (Карскі Я. , Ластоўскі В.)
- Фінская (Ласкоў І.)
- Балцкая (Сядоў У.)
- Савецкая аб Кіеўскай Русі (С. Токараў)
- Сучасная канцэпцыя М. Піліпенкі

# Назва «Беларусь»

- У 12 ст. адносіцца да Уладзіміра-Суздальскага княства.
- У 13-14 стст. адносіцца да Маскоўскага княства, Смаленскіх і Пскоўскіх зямель.
- У 15-16  - “Русь” канфессіёнім ўсіх праваслаўных ВКЛ
- У 17 -18 ст. – Белая Русь - Падзвінне і Падняпроўе, а “Літва” - Міншчына і Гродзеншчына, ці ўсё ВКЛ.
- У 19 ст. – тэрыторыя ўсёй Беларусі.



Полацк
Віцебск
Вільня
Лукомль
Сянно
Ворша
Барысаў
Шклоў
Копысь
Магілёў
Крычаў
Прапойск
Заслаўе
Ліда
Гродна
Менск
Навагрудак
Мір
Нясвіж
Слонім
Клецк
Слуцк
Бабруйск
Рагачоў
Рэчыца
Гомель
Кобрын
Пінск
Тураў
Мазыр
Смаленск
Бранск
Чарнігаў

# Пытанне 3. Першыя княствы на тэрыторыі Беларусі.

862 г. – Полацк упершыню ўзгадваецца ў летапісе.

*907 - узгаданая першая княжна Полацка – Прадслава, яна ўдзельнічае у паходзе варагаў і славян на Канстантынопаль*

*У Полацкім княстве апошняй трэці 10 ст. (да 980 г.) княжыць Рагвалод*

*988 г. -хрышчэнне Уладзіміра, пакушэнне на яго Рагнеды (маці Ізяслава, Яраслава, Мсціслава, Усевалада) за што яна пастрыжаная ў манашкі (Анастасія+1000 г), а Ізяслаў адасланы ў Полацк, дзе аднавіў полацкую дынастыю +1001г.*

*1003 – 1044 княжанне Брачыслава Ізяславіча*

- *1021 г. захоп Ноўгарада і бітва на рацэ Судамір, мір з Яраславам (нам адалі Віцебск і Усвяты) і сумесны паход на Літву ў 1040г., заснаваны Браслаў*
- *1044 -1101 г. княжанне Усяслава Брачыслававіча (Чарадзея)*
- *1065 г. аблога Пскова, 1066 захоп і разрабаванне Ноўгарада*
- *3.03.1067 г. Бітва на Нямізе, палон на Ршы,*
- *1068-ён 7 месяцаў ён князь у Кіеве. У 1071 г. вярнууся ў Полацк.*
- *1078 –ён спаліў Смаленск,а У.Манамах узяў Менск*

# ПОЛАЦКАЕ КНЯСТВА (канец X — пачатак XI ст.)



## 1101 г. раздзел Полацкага княства на Полацкае, Віцебскае, Менскае, Ізяслаўскае, Лагойскае, Друцкае

- Глеб Менскі 1116 г. напаў на Слуцк, 1117 на Оршу і Копысь, за што палонены і атручаны ў 1119 г.
- 1129 г. кіеўскі князь Мсціслаў захапіў 40 полацкіх князёў і саслаў іх з сем’ямі ў Візантыю.
- 1132 г. – полацкае веча выбірае на княжанне Васільку, пачатак вечавой рэспублікі.

1151 -1162 г. вайна Полацка і Менска. першы выгнаны вечам князь Рагвалод Васількавіч і запрошаны Расціслаў Глебавіч

Веча-збор свабодных мужчын па важнейшых пытаннях. Кіруюць мясцовыя алігархі. Як прадстаўнік “міру”-хрысціян (сукупнасці “грамадзян”), дзяржаўныя дамовы першым замацоўваў архіепіскап. Князі становяцца “служылымі”. Вяршыня дадзенага працэсу настала ў 1180 - 1190 г., калі на чале Полацка фармальна стаяла рада з 30 старэйшын.

1186-1216 князь Уладзімір спачатку ваяваў, затым саюз з Смаленскам і Ноўгарадам супраць крыжакоў. З-за апасенняў мангольскіх прэтэнзій пасля разгрому тымі Рурыкавічаў, з 1248 г. у Полацку княжыў выгнаны з Літвы Міндоўгам Таўцівіл,а ў 20-я г. XIV ст. Рурыкавічаў канчаткова замянілі Гедымінавічы.

# Барацьба супраць крыжакоў

- Каталіцкі манах Мейнард у 1184 г. атрымаў дазвол ад Уладзіміра Усяславіча Полацкага на місіянерскую дзейнасць у вусці Зах. Дзвіны. У 1201 г. на тэрыторыі daннікаў Полацкага княства ліваў, нямецкія крыжакі – мечаносцы, святары і каланісты начале з біскупам Альбертам заснавалі г. Рыгу. Яны пачалі сілай абарачаць ў каталіцтва
- балцкія плямёны ліваў, кушаў, селаў, латгалаў і васалаў Полацка – княствы Кукейнос і Герцыке.





Палачане ідуць у няўдалыя паходы супраць ордэну мечаносцаў (з 1237 г. Лівонскі) на Ікскуль і Гольм (1203), Гольм(1206) . Князь Вячка загінуў у Юр'еве(1224)



- Страчаны Кукейнос (1208), Герцыке (1209). Дамова з Рыгай 1210 г. падрыхтоўка пахода 1216. 1223 г. –мір Смаленска і Полацка з Рыгай, вольны гандль па Дзвіне. Саюз Полацка і Віцебска са Смаленскам, Ноўгарадам і Літвой. Палачане у бітвах на Няве 1240, Чудскім в.1242),і в. Дурбе 1260 г.



# Мангола-татарская агрэсія



- 1223-разгром Рурыкавічаў на р. Калка
- У 1238 г. мангола-татары на чале з ханам

Бату разрабавалі Уладзіміра-Суздальскія і Смаленскія землі.

- У 1239 – 1241 гг. паход на Кіеў, Валынь і Польшчу былі спалены Гомель, Тураў, Мазыр, Пінск, Берасце.



- Тарары разгромлены ў 1242 г ля Ліды

хан Койдана і ў 1249 г. пад Крутагор’ем. Негледзячы на частыя спусташальныя набегі, напрацягу ўсяго XIII ст., манголам не ўдалося ўстанавіць сваю ўладу на беларускіх землях.

# Мангольская імперыя






# Тураўскае княства

- У 988 г. кіеўскі кн. Уладзімір Святаслававіч аддаў сыну Святаполку Тураў.
- Тураўскія князі часта траплялі на трон у Кіеў. У 50-я г. 12 ст. Тураў выйшаў з падпарадкавання Кіеву і ў ім усталявалася самастойная дынастыя. Затым у васалах Валынскага к-ва
- У Тураве адначасова з князем кіраваў пасаднік+ тысяцкія.

# Культура

1. Хрысціянізацыя *(988 кіеў, 992 Полацкае біскупства)*
2. Архітэктура *(св.Сафія, Спаса-Прыабражэнская (дойлід Іаан) у Полацку, Белая Вежа ў Камянцы, Барысаглебская (Каложа) у Гародні)*
3. Пісьмовасць *( Тураўскае, Друкае Евангеллі XII ст., Радзівілаўскі летапіс, бераста, Барысавы камяні; Еўфрасіння Полацкая (+1173), Кірыла Тураўскі(1130-1182), Клімент і Аўрамі Смаленскія*
4. Выяўленчае *(роспіс царквы Спаса)* і ювелірнае мастацтва *( крыж Лазара Богшы 1161 г.)*

# Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель.

- Характарызуецца ў 9-12 стст. складваннем раннефеадальных адносін.
- Паралельна існавалі абшчынны ўклад патрыярхальнае рабства (сыны вольныя).
- Асноўнай формай эксплуатацыі сялян стала натуральная даніна (палюдзе раз у год з абшчыны князю жыта, мёд і гд.).
- Фаміраванне прыватнай уласнасці на зямлю. Шляхі : падараванні князя, захоп, распрацоўка, спадчына.

# Віды феадальнага землеўладання:

- Баярскае
- Княскае
- Царкоўнае



Дажывотнае (пажыццёвае) і спадчыннае.

# Катэгорыі сялян:

- Сяляне-смерды дзяліліся на дзьве катэгорыі: свабодных (людзі) і залежных ад землеўлададальніка.
- Закупы –часовазалежныя да моманту вяртання грошай ці прадуктаў “купы”
- Радовічы – заключалі дамову з феадалам “ряд”
- Ізгоі – людзі якія не разлічыліся за пазыкі ці злачынствы
- Чэлядзь, халопы –хатнія рабы

Абшчына збірала даніну, рэгулявала жыццё сялян.

# Асноўныя заняткі насельніцтва:

- Земляробства (прылада – драўлянае рала). Віды: падсечна-агнявое і ворыўнае. Займаліся садаводствам, агародніцтвам, сеялі збожжа, лён.
- Ад сельскай гаспадаркі аддзяляецца рамяство. Рамеснікі і гандляры з’язджаюцца ў гарады. Рамяство (толькі па апрацоўцы жалеза вядома 16 спецыяльнасцей.)
- Гандль: “шлях з вараг у грэкі”+ Прыпяцка-Бугскі і Нёманскі (з Візантыяй, Усходам, Еўропай.)





# Буйныя гарады:

- Полацк (862),
- Тураў (980),
- Брэст (1019),
- Віцебск (1021),
- Менск (1067),
- Гродна (1127),
- Навагрудак (1252) і інш.



Горад складаецца: з дзядзінца, пасада, торга.